Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (598) | Пятніца, 16 красавіка 1965 г. | Год выдання XVIII-ы | Цана 1 кап.

# МЁРТВЫЯ ЗАКЛІКАЮЦЬ

Трасцянец. Год 1965... Стромкі абяліск ахвярам трасцянецкага канцлагера ўзнёсся ў сінечу вясновага неба. Ён нібыта радыёстанцыя, што нясе галасы ахвяр над зямлёю, расказваючы людзям аб зверствах фашысцкіх вылюдкаў.

Людзі, будзьце пільнымі, змагайцеся за мір!.. Гэта заклік **201.500** закатаваных у Трасцянцы.

11 красавіка сюды сабраліся тысячы людзей—студэнты, рабочыя, служачыя Мінска, жыхары навакольных сёл, быўшыя вязні беларускага Майданека. Гнеўныя галасы прысутных асуджаюць, заклікаюць прыцягнуць да адказнасці за зверствы тых фашысцкіх галаварэзаў, якія пакуль яшчэ і сёння гуляюць на волі. Жывыя не могуць і не павінны маўчаць!

Гневам і асуджэннем гучыць голас супрацоўніцы Музея Вялікай Айчыннай вайны Веры Сяргееўны Раманоўскай. Яна заклікае ад імя ўсіх, хто шануе мір на зямлі, патрабаваць выдачы фашысцкіх вылюдкаў на суд народны.

Былі сярод удзельнікаў мітынга і быўшыя вязні Трасцянецкага лагера смерці. Цудам ацалелы ад звярыных лап фашыстаў Мікалай Іванавіч Валахановіч расказаў аб шаленстве гітлераўскіх вaяк у канцлагеры. Ён прыгадаў, што сярод катаў была і разбэшчаная гаўляйтэрамі паскудніца, якая ўласнымі рукамі адпраўляла на гібель дзяцей, жанчын, старых. Фашысты не ведалі, не хацелі ведаць, ці то быў малы, ці стары—усе жорстка знішчаліся.

Гэтыя людаеды спачатку растрэльвалі, а потым спальвалі свае ахвяры на вогнішчах. І толькі адзінкам з тысяч цудам удалося выратавацца.

— Так здарылася і са мной,—кажа М. І. Валахановіч. Я не чуў стрэлаў, а калі ачнуўся, зразумеў, што адно вока выбіла куля і выйшла крыху ніжэй другога. Пад покрывам цемры мне ўдалося адпаўзці за барак, а потым выбрацца з лагера.

Гневам загараюцца вочы людзей, якія слухаюць гэтую жорсткую праўду аб злачынствах фашысцкіх катаў. Міжволі сціскаюцца кулакі. Сэрца не хоча маўчаць! Смерць за смерць! Да адказнасці гітлераўскую пачвару!

На мітынгу ад імя моладзі выступіла студэнтка БДУ імя Ул. І. Леніна Вольга Радзькова. Яна заклікае ўсіх яшчэ настойлівей змагацца за мір, не забываць жудаснай трагедыі другой сусветнай вайны. Мір патрэбен не мёртвым, мір патрэбен жывым,—прызыўна гучыць яе голас.

Гнеўныя словы асуджэння гітлераўскім катам далучылі да шматтысячных галасоў Мінчан і ўдзельнікі мітынга—металургі Кузбаса.

У заключэнне мітынга адбылося ўскладанне вянкоў ля падножжа абяліска.

...На трасцянецкім абяліску болем сэрцаў высечаны словы ўшанавання ахвяр. Яны заклікаюць жывых яшчэ настойлівей працягваць барацьбу за мір, помніць і не дараваць фашыстам зверстваў на нашай роднай беларускай зямлі.

К. МОХАР.



НА ЗДЫМКУ: Выступае быўшы вязень Трасцянецкага лагера смерці М. І. ВАЛАХАНОВІЧ.



НА ЗДЫМКУ: Удзельнікі мітынга нясуць вянкі да падножжа абяліска.

ДА 20-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

# НА ПЕРАПРАВЕ

*Сёння мы даём слова ўдзельніку Вялікай Айчыннай вайны, былому камандзіру ўзвода, выкладчыку кафедры рускай мовы Ул. К. Аляшкевічу.*



**Калі чэрвенскае сонца, не спяшаючыся, садзілася за лесам, мы, дывізійныя сапёры, таропка ішлі да ракі Друць будаваць пераправу.**

**— Не падвядзіце, браточкі!.. Мы дык гакнем па фрыцу!.. Масток каб вытрымаў, рабіце!.. — гукалі артылерысты, праважаючы нас дабрадушнымі позіркамі.**

**Да світання над Друццю чуліся глухія ўдары па палях, тоненька пазваньвалі вострыя пілы, з лёгкім вохканнем пастуквалі сякеры, коратка і рэзка пастуквалі па галоўках цвікоў малаткі. Наводка маста заканчвалася.**

**Працавалі ў гэтыя дні асабліва старанна, з уздымам: турбаваў не загад і не тэрмін — усе чакалі дня наступлення, як светлага свята, як найвялікшай падзеі. Аб беларусах, а іх нямала было ў нашай, 399 стралковай дывізіі, і гаварыць няма чаго: родная зямля прыдавала ім сілы, саграваль душу, мацавала мужнасць.**

**Войскі Першага Беларускага фронта рыхтаваліся да прарыву. Кожны салдат і афіцэр ведаў—вораг яшчэ дужы: за балацянкамі Друці, на шмат кіламетраў углыб,—шэсць ліній траншэй, мінныя палі, калючы дрот, артылерыя ўсіх калібраў. Выбіць ворага будзе нялёгка.**

**І вось, нарэшце, наступіла 24 чэрвеня. Напярэдадні ноччу пад густы строкат «кукурузнікаў» мы праклалі па сырым лузе дарогу з драўляных шчытоў—для гармат. Пяхота выходзіла на зыходны рубеж, артылерысты падцягвалі гарматы бліжэй.**

**А роўна а чацвертай гадзіне раніцы сотні нашых гармат адкрылі ўраганны агонь. Дрыжэла зямля, трапяткім раптам, зрабілася лісце на дрэвах і кустах, паветра калыхалася густымі наплывамі. Білі дзве гадзіны. Над нямецкім пярэднім краем вырасла высокая шэраімглістая сцяна дыму і пылу. Здавалася, што там, за гэтай непраглядняй паласой, нічога жывога ўжо няма.**

**Ды вось недабітыя яшчэ нямецкія батарэі пачалі агрызацца. Нашы ўдарылі па іх. Двое салдат з майго ўзвода знаходзілася ў гэты час каля маста. Астатнія схаваліся ў невялікім хвайнячку, метрах у ста дваццаці ад берага Друці. Поруч з намі—76 міліметровая гармата, ад яе страляніны ў вушах—звон і глухата.**

**Кусаючы губы, мы пазіралі ў неба: яно было ўсё ў хмарах, нізкіх, цяжкіх—авіяцыі не разгарнуцца.**

**Гарматы не сціхалі. Раз-пораз у іх гул дамешвалася пявуча-рэзкае скрыгітанне «кацюшы» — з беразняка ўзляталі маланкава вырaі вогненных мячоў і несліся туды, на ворага, у імглістую слепату дыма.**

**Каля поўдзеня наша пяхота выбіла немцаў з першай лініі траншэй. Гарматы мянялі пазіцыі. І ў гэты час ад маста прыбег сапёр Садыкаў: на пераправу ўпала два снарады, трэба тэрмінова наводзіць пантон.**

**Дванаццаць сапёраў падымаюць лодку, выходзяць з хвайнячка. На поўны рост, па полі, пад абстрэлам. Назад — бягом. І гэтак тры разы. Цуд і толькі—нікога не параніла, не забіла. Не прайшло паўгадзіны—пантон наладжаны, трос напяты, гарматы паплылі на той бераг.**

**Неўзабаве неба пачало праясняцца. Па зялёным лузе да нашага маста ішлі, накульгваючы, параненыя — шмат у каго на галовах бялелі бінты.**

**Міны завылі нечакана. Адзін залп, потым, бліжэй—другі, нейкі прамежак часу — трэці... Мяне параніла ў нагу.**

**...Калі санітар зрабіў перавязку і я, абапіраючыся на кульбачку, адыходзіў ад ракі, у небе, ужо зусім чыстым, высокім, сінім, выплылі нашы бамбавозы. Здавалася, у небе ім было цесна—гэтулькі іх было! Забыўшыся аб ране і аб тым, што наўкол не заціхаюць выбухі, я стаяў каля дарогі, задраўшы галаву. Стаяў і адчуваў, як да горла падступае— не праглынуць ком, а ў вачах—закруціліся слёзы. Гэта былі і слёзы гонару за нашу армію, нашу сілу, нашых крылатых герояў. І ў той жа час слёзы горычы—вось толькі пачалося самае галоўнае, нашыя развіваюць поспех, ідуць наперад, а мне—у шпіталь...**

# ЗА ДОБРУЮ РАБОТУ—ПАДЗЯКА!

*Нам хочацца добрым словам расказаць аб добрасумленнай працы лабаранткі кабінета беларускай мовы Іны Афанасьеўны Каралёвай. Нас вельмі многае звязвае з гэтым кабінетам. З першага курса мы працуем у дыялектычным гуртку і таму ўжо само сабой зразумела, што працаваць нам прыходзіцца ў кабінеце беларускай мовы.*

*Работа ў гуртку, курсавыя работы, даклады, падрыхтоўка да экзаменаў... Усе гэтыя работы выконваліся ў кабінеце беларускай мовы. Патрэбна адразу сказаць, што не адзін раз прыходзіла нам на дапамогу Іна Афанасьеўна. Адчуваецца, што яна добра ведае і любіць сваю справу. Вельмі прыемнае ўражанне пакідаюць самі адносіны яе да працы. Іна Афанасьеўна ніколі не спазняецца на работу.*

*Хіба не можа нас кранаць тое, як у час гэтай зімовай сесіі яна праседжвала з намі цэлыя дні ў кабінеце. Як для нас, студэнтаў, так для Іны Афанасьеўны Каралевай у час сесіі не было выхадных дзён. Кабінет працаваў нават у нядзелю.*

*Цяпер мы знаходзімся на практыцы ў школе. З першага дня практыкі мы ўбачылі, што без кабінета беларускай мовы нам не абыйсціся. Тут жа сабрана ўся метадычная літаратура, школьныя дапаможнікі. І пацягнуліся зноў напружаныя дні працы. Калі б не зайшоў у кабінет, цябе сустрэне прыветлівая ўсмешка лабаранткі, яе падтрымка, добрая парада, дапамагае.*

*Група студэнтаў філалагічнага факультэта.*

# ВЯСНОВАЯ ЛІРЫКА

Не смуці свае вочы сінія,
Не сумуй, стань сягоння
вясёлкай:
Ён чакае цябе, адзіную,
І сустрэне аднойчы на золку.
Скажа добрае нешта, цёплае,
І ўжо йсці вам дарогай
адною...
Не сумуй, будзь сягоння
вясёлкаю,
Будзь сягоння самой
вясною!..

**Галіна ПАНЬКО.**



Жыццё ў пупышках ледзьве
цепліцца,
Вярба ўся спалатнелая ад
сну...
Спяшаць дзяўчаты,—
ім ніяк не церпіцца—
Каб хоць на тыдзень
абхітрыць вясну.
Галінкі тыя, што дагэтуль
стылі,
Што нерухома віслі
над ракой,
Дзяўчаты раніцой
угаварылі
Да іх перасяліцца ў пакой.
Пупышкі страпянуліся
адразу,
Узрадаваліся—будуць жыць!
І дзюбкі лісцікаў раскрыла
ваза,
Як птушанё, якое хоча піць.
А на стале разгорнутая
кніжка,
Дзяўчат гіпнатызуе
маладзік,
Забыліся зялёныя
пупышкі,
Што ўчора іх марозіў
сакавік.

**Мар'ян ДУКСА.**

